


**Афіцэры таксама плачуць. 1 ліпеня ля Нацыянальнай бібліятэкі ва ўрачыстай абстаноўцы адбыўся чарговы выпуск спецыялістаў Камандна-інжынернага інстытута Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Сёлета ўпершыню сярод выпускнікоў, якія навучаліся на дзённай форме навучання па спецыяльнасці «Папярэджанне і ліквідацыя надзвычайных сітуацый», — 8 дзяўчат. У часе цырымоніі выпускніцы не хавалі эмоцый.**




**Улады адзначылі 3 ліпеня шэсцем ветэранаў вайны па праспекце да плошчы Перамогі. Як і заўжды, у дэфілядзе ўдзел бралі дэлегацыі прадпрыемстваў і праўладных суполак. Сёлета выйшлі на парад і так званыя «беларускія казакі» — арганізацыя, сфармаваная на ўзор расійскага казацтва.**




**Іх вярхоўны атаман Мікалай Улаховіч апрануўся Сталіным, хоць той вынішчаў казакоў пад корань.**

**Самы папулярны віцебскі інтэрнэт-партал — незалежныя «Народныя навіны Віцебска», news.vitebsk.cc, выбірае Міс Інтэрнэт. 11 прыгажунь змагаюцца за гэты тытул. Галасаванне працягнецца да 6 ліпеня. Пераможца атрымае пуцёўку ў Крым. У аналагічным конкурсе летась перамагла Кася Сціпанава, студэнтка Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта.**






## Анекдоты

Нарадзіўся, пасля пайшоў у дзіцячы садок, потым у школу, затым скончыў універсітэт, пайшоў працаваць, ажаніўся — і вось ты ўжо са сваімі дзецьмі выходзіш на шпацыр. А бабулькі ля пад'езда ўсё тыя ж самыя...

* * *

Сустракаюцца двое:

— Я чуў, у цябе дачка нарадзілася пазаўчора?

— Так, мы пачалі ўжо збіраць на пасаг!

— А ў мяне ўчора нарадзіўся сын! Пачалі збіраць на ваенкамат!

* * *

Доктар уваходзіць у палату, дзе ляжыць маладая жанчына.

— Добры дзень, раздзявайцеся — мне трэба вас агледзець...

— Але ваш калега ўжо аглядаў мяне і казаў, што я ў добрай форме!

— Так, так, менавіта гэта ён і мне казаў...

* * *

Патлумачце нарэшце, у чым семантычная, эканамічная і палітычная розніца між паняткамі «энергетычная імперыя» і «сыравінавы прыдатак»?

* * *

Нішто так не бадзёрыць з раніцы, як своечасова не заўважаны вушак...

## «НН» сто гадоў з вамі

**Клюшчаны Свянцянскага пав.** Без мала людзей любяць у нас сваю мову і стараюцца захаваць яе; кажуць яны, што бацькі, дзяды і прадзеды мовай гэтай гукалі і абыходзіліся ёй. Некаторыя з гэтых людзей казалі мне, што іх бацькі, уміраючы, разам з багаслаўленнем казалі ім шанаваць родную мову і трымацца старых звычаяў, а таксама і яны самі, калі Бог не адбярэ ў апошнія мінуты мовы, перакажуць тое самае сваім дзецям.

**«НН». №28. 1910**

**Камуністы ў дабрачынных сталоўках.** Барысаўскае габрэйскае таварыства «Святло Меноры» ад чэрвеня пачало арганізоўваць бясплатныя штодзённыя абеды пры сталоўцы, што на цэнтральным праспекце Рэвалюцыі, дзе харчуюцца з паўсотні галодных барысаўцаў. Сталымі спажыўцамі дармовага харчу з'яўляюцца не толькі людзі, што начуюць у каналізацыях і сутарэннях, але й звычайныя ветэраны. Некаторыя з іх дагэтуль носяць значкі кшталту «Ударнік камуністычнае працы». Гады ўдарнае камуністычнае працы прывялі да аднаго выніку — поўнае занядбанасці.

**«НН». №27. 2000**

**Адказы на кемікі са старонкі 15.**

1) Сухіх. 2) Дзірка. 3) Сон. 4) Цень.

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф-рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6350.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 06.07.2010.
Замова № 3242.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614